аказваць дапамогу розным групам насельніцтва [3]. Гэтая арганізацыя стала больш універсальнай. Яе праграмы пачынаюць закранаць не толькі дабрачынную сферу, але і фінансавую. Такім чынам, Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжу з'яўляецца актыўным удзельнікам руху Чырвонага Крыжу і Чырвонага Паўмесяца і, нягледзячы на складаныя перыяды ў жыцці рэспублікі, ажыццяўляе дабрачынную дзейнасць.

*Літаратура*

1. Романовский, А.А. Красный Крест – взываем к милосердию и человеколюбию / А.А. Романовский, З.А. Павлович // Юстыцыя Беларусі. – 1999. – № 3. – С. 68–71.
2. Ленская, А. Милосердие не иссякает / А. Ленская // Гродзенская праўда. – 1998. – 21 мая. – С. 2.
3. Калинка, И.А. Белорусский Красный Крест / И.А. Калинка // Вопросы организации и информации здравоохранения. – 2005. – № 3. – С. 48–49.
4. Красный Крест // Бюллетень Белорусского Красного Креста. – 2004. – № 1 (15). – С. 7.
5. Красный Крест // Бюллетень Белорусского Красного Креста. – Минск, 2002. – С. 5–6.
6. Красный Крест и благотворительность: материалы научной конференции, посвященной 120-летию Гродненского общества Красного Креста / Гродненский государственный медицинский институт. Управление здравоохранения Гродненского облисполкома. Гродненский областной комитет Красного Креста. Гродненское научное общество историков медицины; редкол. Е.М. Тищенко (гл. ред) [и др.]. – Гродно, 1995. – 186 с.
7. Тищенко, Е.М. Здравоохранение Беларуси в XIX – XX вв. / Е.М. Тищенко. – Гродно: ГГМУ, 2003. – 270 с.
8. Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці (ДАГВ). Фонд 2811. – Воп. 2. – Спр. 191.
9. Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці (ДАГВ). Фонд 2811. – Воп. 2. – Спр. 194.
10. Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці (ДАГВ). Фонд 2811. – Воп. 2. – Спр. 197.
11. Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці (ДАГВ). Фонд 2811. – Воп. 2. – Спр. 200.
12. Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці (ДАГВ). Фонд 2811. – Воп. 2. – Спр. 188.
13. Клечковская, Л.Г. История становления и деятельности Гродненского общества Красного Креста / Л.Г. Клечковская, Е.М. Тищенко // Красный Крест и благотворительность: материалы научной конференции, посвященной 120-летию Гродненского общества Красного Креста / Гродненский государственный медицинский институт. Управление здравоохранения Гродненского облисполкома. Гродненский областной комитет Красного Креста. Гродненское научное общество историков медицины; редкол. Е. М. Тищенко (гл. ред) [и др.]. – Гродно, 1995. – С. 13–27.
14. Абраменко, М.Е. Развитие движения безвозмездного донорства в Гомельской области (1965–1976) / М.Е. Абраменко // Красный Крест и благотворительность: материалы научной конференции, посвященной 120-летию Гродненского общества Красного Креста / Гродненский государственный медицинский институт. Управление здравоохранения Гродненского облисполкома. Гродненский областной комитет Красного Креста. Гродненское научное общество историков медицины; редкол. Е.М. Тищенко (гл. ред) [и др.]. – Гродно, 1995. – С. 27–30.

Наступіў у рэдакцыю 12.04.2006.

***Мінаева Наталля Міхайлаўна***, аспірантка кафедры гісторыі Беларусі ГрДУ імя Я. Купалы. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, прафесар І.П. Крэнь.

The article is devoted to the issues of the activity of one of the oldest international charity, i.e. the Red Cross and its branch in the Republic of Belarus. History of organization and the arrival of the Red Cross to the territory of Belarus have been shown in the material. The basic lines of organization's activity during the period from 1991 to 2001 are also analyzed.

УДК 947.6 + 323.1

**А.М. Вабішчэвіч**

# ДЗЕЙНАСЦЬ ЛІТОЎСКІХ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ НА БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКА-ПОЛЬСКІМ ПАМЕЖЖЫ Ў 20–30-Я ГГ. ХХ СТ.

В статье рассматривается становление и развитие литовского культурно-просветительского движения на белорусско-литовско-польском пограничье в 1920–1930 гг. на примере товариществ «Ритас» и Св. Казимира. Функционирование литовских школ, библиотек-читален, кружков отражено в общем контексте общественно-политической ситуации в регионе. Кроме монографической литературы, автор использовал документы из архивов Беларуси, Литвы, Польши, большинство которых впервые введены в научный оборот. Данное исследование подготовлено при поддержке Белорусского республиканского фонда фундаментальных исследований в рамках проекта Г05Р – 027.

Праблемы нацыянальна-культурнага жыцця заходнебеларускіх зямель у складзе Польшчы ў 1920–1930 гг. з'яўляюцца ўжо некалькі дзесяцігоддзяў аб'ектам даследаванняў у айчыннай гістарычнай навуцы. Пры гэтым галоўная ўвага звярталася пераважна на вывучэнне разнастайных аспектаў асветы, культуры беларусаў, аўтахтоннай этнічнай большасці. Пытанні функцыянавання культур іншых этнічных супольнасцей звычайна не закраналіся. Гэта не давала поўнага і аб'ектыўнага ўяўлення аб грамадскай і духоўнай спадчыне заходнебеларускага рэгіёна. І толькі на сучасным этапе з'явіліся магчымасці для пазнання яе полікультурнага характару на новай метадалагічнай аснове, з выкарыстаннем гістарычных крыніц, якія не выкарыстоўваліся папярэднімі даследчыкамі.

У перыяд паміж Першай і Другой сусветнымі войнамі ў польскай і літоўскай літаратуры тэры-

торыя, на якой разгортвалася культурна-асветніцкае жыццё літоўскай супольнасці, разглядалася ў якасці «паўночна-ўсходніх зямель» Польшчы ці ўсходняй часткі Літвы. Напружаны характар міждзяржаўных адносін прадвызначыў тэндэнцыйны падыход у асвятленні дадзенай праблематыкі. Толькі ў апошнія дзесяцігоддзі XX ст. назіралася яе ўзважлівае вывучэнне ў польскай і літоўскай гістарыяграфіі: ў комплексным даследаванні Б .Макоўскага пра становішча літоўцаў у міжваеннай Польшчы [1] (пазней было выдадзена і па-літоўску), манаграфіі В. Марцінкенаса «Літоўскія школы і чытальні Віленшчыны ў 1919–1939 гг.» [2], калектыўнай працы «Літоўцы Лідскага краю» [3] і інш. Літоўскі культурна-асветніцкі рух пададзены як адзінае цэлае, у цеснай узаемасувязі з тагачаснай літоўскай дыяспарай. Ніякіх яго рэгіянальных адметнасцей не вылучалася. Таму і набывае значнасць у цяперашніх умовах даследаванне тых памежных беларуска-літоўска-польскіх зямель, дзе не было дамінацыі літоўцаў сярод насельніцтва, але назіралася актыўнасць іх грамадскіх арганізацый у 1920–1930 гг. Выкананне гэтай мэты немагчыма без увядзення ў навуковы абарот разнастайных архіўных матэрыялаў.

Дакладнай статыстыкі колькасці літоўскага насельніцтва ў міжваеннай Польшчы няма. Хоць вызначэнне іх ліку не з'яўляецца задачай дадзенага даследавання, аднак неабходна адзначыць асноўныя падыходы ў асвятленні гэтага супярэчлівага пытання. Паводле перапісу насельніцтва 1921 г., які не ахопліваў тэрыторыю Сярэдняй Літвы, усяго ў Польшчы было 65,5 тыс. літоўцаў. Адчувальнай была прысутнасць літоўцаў у Свянцянскім, Віленска-Трокскім, Сувалкаўскім паветах, дзе яны пражывалі кампактнымі групамі. У памежных паветах – Лідскім, Гродзенскім, Браслаўскім, Пастаўскім, Дзісенскім, Вілейскім, Навагрудскім, Ашмянскім – колькасць літоўцаў была нязначнай [4, с. 244, 245]. Большасць з іх жыла ў сельскай мясцовасці. Прызнаючы недасканаласць перапісу, Л. Васілеўскі адстойваў лічбу 70 тыс. літоўцаў (0,2 %) [5, с. 247]. Перапіс насельніцтва 1931 г., які таксама праводзіўся з грубымі парушэннямі, зафіксаваў усяго ў Польшчы 82,3 тыс. літоўцаў, з іх у Віленскім ваяводстве – 66,8 тыс., у Беластоцкім – 13,1 тыс., у Навагрудскім – 2,5 тыс. чалавек [6, с. 153]. Польскія і літоўскія вучоныя падверглі крытыцы згаданыя статыстычныя звесткі. Колькасць літоўскага насельніцтва ў міжваеннай Польшчы ацэньваецца імі пераважна ў межах 80–250 тыс. чалавек [1, с. 323; 7, с. 126; 8, с. 219]. Большасць яго жыла на тэрыторыі, уключанай у склад Літвы ў 1939–1940 гг.

Характар узаемаадносін літоўскай і польскай супольнасцей на працягу ўсяго міжваеннага часу прадвызначала пытанне аб прыналежнасці Віленшчыны. Асабліва яскрава польска-літоўскі канфлікт праяўляўся ў нацыянальна-культурным жыцці адпаведна літоўцаў у Польшчы і палякаў у Літве. У Літве друк, школы, касцёл, арганізацыі разглядалі палякаў як заклятых ворагаў літоўскага народа [9, с. 112; 10, с. 221–228]. У Польскай дзяржаве гвалтоўнае апалячванне літоўцаў праводзілася дзяржаўнымі ўстановамі, адукацыяй, каталіцкім касцёлам, друкам. У памежных паветах найбольш адчувалася напружаная сацыяльна-псіхалагічная атмасфера ў адносінах літоўцаў, якія складалі меншасць, і палякаў. У справаздачы аб грамадска-палітычнай сітуацыі ў Лідскім павеце ў верасні 1925 г. адзначалася, што літоўскае насельніцтва «пазбягае выкарыстання польскай мовы, карыстаецца выключна літоўскай мовай і нават на зададзеныя пытанні адмаўляецца адказваць па-польску, тлумачыць гэта неразуменнем» [11]. Паліцэйскі пастарунак дзяржпаліцыі ў в. Бершты Гродзенскага павета ў кастрычніку 1926 г. падкрэсліваў, што характэрным для мясцовага беларускага і літоўскага насельніцтва было «максімальнае аддаленне ад усяго польскага» [12]. Ва ўмовах мэтанакіраванай асіміляцыйнай палітыкі польскіх урадаў істотнае значэнне для літоўцаў набыло пытанне аб этнічным самазахаванні. Дзякуючы мабілізацыі пераважна знешняга фактару (уплыву Літвы), у такіх абставінах удалося стварыць арганізаваны літоўскі культурна-асветніцкі рух, які польская адміністрацыя не прызнавала ў якасці самастойнага.

Літоўскае асветніцкае таварыства «Рытас» («Ранак») (Lietuviŭ Pvietimo Draugija «Rytas»), якое ўзнікла яшчэ ў 1913 г. у Вільні, распачало сваю дзейнасць у складаных абставінах пачатку 1920-х гг. у межах Сярэдняй Літвы. Праведзеныя ў студзені 1922 г. выбары ў віленскі сейм і далучэнне Сярэдняй Літвы да Польшчы суправаджаліся рэпрэсіўнымі дзеяннямі супраць літоўскага і беларускага рухаў. Гэта прывяло да спаду актыўнасці таварыства «Рытас» вясной 1922 г., асабліва ў тых памежных паветах, дзе літоўская прысутнасць была нязначнай. Так, у Ашмянскім павеце «літоўская агітацыя ў цэлым заціхла», літоўскі рух праявіў сябе толькі ў гміне Дзевянішкі [13].

Пасля непрацяглага заняпаду з 1923 г. назіраўся ўздым актыўнасці «Рытас». Як адзначалі польскія ўлады, ў Лідскім павеце мясцовыя кіраўнікі «Рытас», ксяндзы-літоўцы перайшлі ад асцярожнай да «цалкам адкрытай, смелай, выразна антыдзяржаўнай дзейнасці, накіраванай на рэалізацыю прэтэнзій і дамаганняў Ковенскай Літвы» [14]. Адметнай рысай у функцыянаванні гэтай культурна-асветніцкай арганізацыі з'яўлялася тое, што ўвесь цяжар працы прыходзіўся не столькі на гурткі, колькі на літоўскія школы. Таварыства «Рытас» праяўляла клопат пра прыватныя навучальныя ўстановы. Іх колькасць павялічылася з 16 (619 вучняў) у 1923/1924 навучальным годзе да 91 (3 тыс. вучняў) у 1926/1927 навучальным годзе (у Віленскім павеце – 42, Лідскім –

21, Гродзенскім – 18, Браслаўскім – 5, Ашмянскім – 4, Свянцянскім – 1). Паводле іншых звестак, у 1927 г. налічвалася 100 прыватных літоўскіх пачатковых школ (3,6 тыс. вучняў) [3, с. 143]. Акрамя таго, ў Вільні дзейнічала гімназія і настаўніцкая семінарыя. Становішча літоўскіх школ ускладнялася недахопам педагагічных кадраў, адмовамі ў зацвярджэнні належнага настаўніцкага персаналу, арыштамі. У вучэбным працэсе нельга было выкарыстоўваць падручнікі, надрукаваныя ў Каўнасе, бо ў іх на картах Віленшчына была абазначана як «зямля, акупаваная Польшчай».

З-за папярэдніх ваенных разбурэнняў, галечы матэрыяльнае становішча літоўскіх вяскоўцаў на памежжы было складаным. Абсалютная большасць з іх належала да малазямельных гаспадарак. У гэтых абставінах спадзяванні адносна развіцця адукацыйных і культурных установаў былі звязаны найперш са знешнім фактарам. Істотную матэрыяльную падтрымку (асабліва ў 1920-я гг.) аказвалі дзяржаўныя структуры Літвы, замежная літоўская дыяспара. У 1924 г. грашовая дапамога літоўскага ўрада складала 1153 тыс. літаў (каля 1 млн. злотых), у 1925 г. – 1879 тыс. літаў, у 1926 г. – 2706 тыс. літаў [1, с. 175]. Большая частка гэтых сродкаў ішла на прыватную адукацыю. Настаўнікі літоўскіх школ, кіраўнікі бібліятэк, чытальняў атрымоўвалі дадатковую плату [10, с. 159]. Пэўную дапамогу аказваў і СССР, які не быў зацікаўлены ў згасанні польска-літоўскага канфлікту.

Узмацненне з 1926 г. аўтарытарных тэндэнцый ва ўнутраным жыцці Польшчы і Літвы (усталяванне рэжыма «санацыі» Ю. Пілсудскага, прыход да ўлады ўрадаў А. Вальдэмараса, А. Сметоны) рэзка пагоршыла нацыянальна-культурнае жыццё адпаведна літоўскай і польскай меншасцей. Кожны з бакоў памылкова разглядаў ганенні і рэпрэсіўныя дзеянні ў якасці сродкаў уздзеяння для паляпшэння становішча сваіх суайчыннікаў. У Літве былі закрыты амаль усе польскія арганізацыі, праведзены масавыя арышты, з 57 прыватных і 26 дзяржаўных польскіх школ засталіся адзінкавыя. Да 1939 г. уцалела толькі 10 польскіх пачатковых школ (222 вучні) [15, с. 28; 9, с. 113]. У складзе Польшчы літоўская меншасць падвяргалася нацыянальна-рэлігійнаму ўціску. Віленскі архібіскуп Р.Ялбжыкоўскі праводзіў адносна літоўцаў, як і беларусаў, актыўную паланізатарскую палітыку. Ксяндзоў-літоўцаў наўмысна пераводзілі ў парафіі, дзе пераважала нелітоўскае насельніцтва. Польскія ўлады праводзілі шматлікія рэвізіі ў суполках «Рытас», арышты актывістаў і іх дэпартацыі ў Літву. Па ўказанню куратара Віленскай школьнай акругі 4 кастрычніка 1927 г. былі закрыты 42 школы, большасць якіх размяшчалася ў Віленска-Трокскім павеце. У Лідскім павеце было закрыта 18 школ – у вёсках гмін Радунь, Эйшышкі, Мацкішкі, Жырмуны, Беняконі, Седлішкі.

Гвалтоўнае абмежаванне літоўскай прыватнай адукацыі з канца 1927 г. азначала завяршэнне перыяду часовага ўздыму ў дзейнасці «Рытас» і пераходу да самазахавання, якое суправаджалася стратамі ранейшых дасягненняў. З пачатку 1930-х гг. такая негатыўная тэндэнцыя паглыблялася. У 1934/1935 навучальным годзе таварыства ўтрымлівала ўсяго 15 школ [1, с. 121, 191]. У 1934 г. у Відзах дабіваліся адкрыцця школы «Рытас», але беспаспяхова. Замест прыватных літоўскіх школ у некаторых мясцовасцях адкрывалі дзяржаўныя польска-літоўскія. Яскрава аб гэтым сведчыць статыстыка па Гродзенскаму павету. У пачатку 1930 г. таварыства «Рытас» мела там на ўтрыманні 22 пачатковыя школы, з якіх 16 у гміне Марцінканцы, 4 – Парэчча, 2 – Бершты. У 1931/1932 навучальным годзе колькасць школ зменшылася да 17 (з іх у Парэцкай гміне засталася толькі 1 (Азёры), у Берштаўскай гміне ўцалелі 2 (Кабелі II і Шумы)), а праз год было толькі 7 польска-літоўскіх школ (515 вучняў) [16; 17].

З 1932 г. асноўная ўвага таварыства «Рытас» была звернута на стварэнне бібліятэк-чытальняў, якія нярэдка з'яўляліся адзінымі цэнтрамі культурнага жыцця літоўцаў. Яны адкрываліся звычайна там, дзе раней існавалі літоўскія школы. Напрыклад, восенню 1933 г. таварыства «Рытас» разгарнула працу ў гэтым напрамку ў гміне Марцінканцы Гродзенскага павета. Кіраўнікамі бібліятэк-чытальняў прызначаліся пераважна былыя літоўскія настаўнікі. Як і літоўскія школы, гэтыя ўстановы таксама разглядаліся польскімі ўладамі як «ачагі антыдзяржаўнай дзейнасці». У сакавіку 1934 г. стараста Валожынскага павета не дазволіў таварыству «Рытас» адкрыць народныя чытальні, бібліятэкі ў в. Лаздуны і Баброўічы [18]. У гістарычнай літаратуры няма дакладнай статыстыкі бібліятэк-чытальняў «Рытас». Паводле В. Марцінкенаса, у 1932 г. было 3 літоўскія чытальні, у 1936 г. – 97 [2, с. 122), па іншых ацэнках іх колькасць вагалася ад 130 да 157 [1, с. 214].

Найбольш уплывовай арганізацыяй сярод вяскоўцаў-літоўцаў з'яўлялася Літоўскае таварыства выхавання і апекі моладзі імя Св. Казіміра (таварыства Св. Казіміра) (Lietuviш pv. Kazimiero Jaunimui Auklnti ir Globoti Draugija), якое знаходзілася пад уплывам літоўскіх хрысціянскіх дэмакратаў. Гэтая культурна-асветніцкая і рэлігійная арганізацыя пачала дзейнічаць намаганнямі віленскай літоўскай інтэлігенцыі, асабліва ксяндзоў, яшчэ ў пачатку 1920-х гг., але была зарэгістравана польскімі ўладамі толькі ў кастрычніку 1925 г. У адрозненне ад «Рытас», таварыства Св. Казіміра вызначалася сваім нацыянальна-клерыкальным характарам, што спрыяла ў тагачасных умовах яго аўтарытэту ў асяроддзі літоўскага насельніцтва. Немалая роля ў гэтым была і ксяндзоў-літоўцаў, якія праяўлялі найбольшую настойлівасць у адстойванні нацыянальных інтарэ-

саў. Арганічнае спалучэнне ў дзейнасці таварыства Св. Казіміра нацыянальнага і рэлігійнага фактараў якраз і прадвызначыла пашырэнне яго ўплыву. Да 1932 г. колькасць гурткоў (аддзелаў) таварыства Св. Казіміра дасягнула 298, з іх у Віленскім ваяводстве размяшчаліся 233, Навагрудскім – 40, Беластоцкім – 25 [19, с. 128]. У 1934 г. агульная колькасць гурткоў дасягнула 405 (каля 16 тыс. чалавек), у 1935 г. – 477 (каля 20 тыс. чалавек). З іх больш паловы прыходзілася на Свянцянскі, Віленска-Трокскі, Сувалкаўскі паветы, дзе была большай наяўнасць літоўцаў. У памежных мясцовасцях сетка гурткоў таварыства не была такой густой: у Лідскім павеце – 30, Браслаўскім – 26, Ашмянскім – 14, Гродзенскім – 9 [1, с. 138 – 139, 141; 3, с. 153]. Менавіта таму з сярэдзіны 1930-х гг. кіраўніцтва таварыства Св. Казіміра шмат увагі надавала арганізацыйнай і прапагандысцкай працы ў памежных рэгіёнах. Аб гэтым сведчыць правядзенне ў лістападзе 1935 г. ў в. Пеляса Лідскага павета з'езда прадстаўнікоў таварыства пад кіраўніцтвам старшыні В.Ташкунаса. Акрамя Радуньскай гміны, куды ўваходзіла в. Пеляса, у тым жа Лідскім павеце гурткі таварыства Св. Казіміра дзейнічалі таксама ў гмінах Беняконі, Воранава, Жырмуны [20]. У Ашмянскім павеце ажыўленне было ў гміне Дзевянішкі, дзе яшчэ ў пачатку 1920-х гг. адзначаўся ўплыў каталіцкіх ксяндзоў-літоўцаў на мясцовае літоўскае насельніцтва [21]. У Браслаўскім павеце гурткі, чытальня і некалькі літоўскіх школ дзейнічалі ў мястэчку Опса і суседніх вёсках.

Разам з разгортваннем сеткі гурткоў таварыства ствараліся бібліятэкі-чытальні, дзе праводзіліся лекцыі, гутаркі, сельскагаспадарчая самаадукацыя, выступалі самадзейныя аматарскія калектывы, хоры. У бібліятэках-чытальнях працавалі прыватныя літоўскія школы (пасля іх закрыцця), ажыццяўлялася хатняе навучанне. Паводле афіцыйных польскіх звестак, у кастрычніку 1935 г. таварыства Св. Казіміра мела 131 бібліятэку, з іх абсалютная большасць (124) размяшчалася ў Свянцянскім павеце, адзінкі – ў Браслаўскім і Гродзенскім паветах [1, с. 215]. Такая мізэрная колькасць бібліятэк у памежных мясцовасцях істотна абмяжоўвала магчымасці для існавання літоўскага руху.

У ходзе ажыццяўлення культурна-асветніцкай работы адбывалася актыўнае супрацоўніцтва гурткоў таварыства Св. Казіміра са структурамі «Рытас». Літоўскае насельніцтва не рабіла вялікіх адрозненняў паміж імі. Напрыклад, у пачатку 1932 г. частка навучэнцаў школы «Рытас» гміны Берштты Гродзенскага павета ўваходзіла ў гурток таварыства Св. Казіміра суседняй гміны Марцінканцы [22]. Вясной 1936 г. кіраўнікі шэрагу чытальняў «Рытас» гміны Марцінканцы дамовіліся з мясцовымі гурткамі таварыства Св. Казіміра аб пабудове народных дамоў для размяшчэння там культурна-асветніцкіх арганізацый, кааператываў, чытальняў. Як адзначала Беластоцкае ваяводскае ўпраўленне, ў красавіку 1936 г. «акцыя па будаўніцтву літоўскіх народных дамоў ахоплівае ў Гродзенскім павеце ўсё большыя слаі і карыстаецца вялікім задавальненнем літоўцаў» [23].

Да сумеснай працы са структурамі «Рытас» і таварыства Св. Казіміра далучаліся і іншыя грамадскія арганізацыі літоўцаў Віленшчыны. Актыўна супрацоўнічала з імі ў час канікулаў нешматлікая навучэнцкая моладзь, якая належала да Віленскага літоўскага студэнцкага саюза (Vilniaus Lietuviш Studentш Sajunga). У асобных населеных пунктах дзейнічалі аддзелы Саюза літоўскіх настаўнікаў (Lietuviш Mokytojш Sajunga).

Нягледзячы на пастаяннае выкарыстанне паліцэйска-адміністрацыйных мер, польскія ўлады ў першай палове 1930-х гг. не змаглі паралізаваць літоўскі культурна-асветніцкі рух. У снежні 1933 г. на канферэнцыі павятовых старастаў Навагрудскага ваяводства ўлады Лідскага павета папракалі ў адсутнасці поўнай інфармацыі пра дзейнасць нелегальных літоўскіх школ, чытальняў, гурткоў. Планавалася выявіць «літоўскі след» у Валожынскім і Шчучынскім паветах, хоць тутэйшых літоўцаў там было няшмат. Валожынскі староста выказаў занепакоенасць уцягваннем мясцовай моладзі ў літоўскі рух. «Вельмі лаяльны хлопец, паляк, які быў нават кіраўніком аддзела «Стралецкага саюза», зараз вучыцца ў Вільні за кошт літоўскіх арганізацый. У другім выпадку сын члена сейміка, лаяльнага чалавека, вучыцца таксама ў Вільні за кошт літоўскіх арганізацый. Падобных стыпендыятаў з Валожынскага павета – 22» [24]. Навагрудскі ваявода С.Свідэрскі даручыў школьнаму куратарыуму забараніць навучанне польскіх дзяцей у літоўскіх школах, пры неабходнасці выдзяляць дапамогу вучням з незаможных сем'яў, каб «уберагчы іх ад літоўскіх уплываў». Для ўзмацнення польскасці было рэкамендавана зацікавіць настаўнікаў таварыства «Рытас» працай у грамадскіх пачатковых школах.

З сярэдзіны 1930-х гг. польская адміністрацыя перайшла да рашучых дзеянняў адносна літоўцаў. З такой ініцыятывай выступала ў 1936–1938 гг. польскае міністэрства замежных спраў, якое схілялася ў бок абвастрэння курса адносна Літвы. Адпаведны план бягучых і перспектыўных мерапрыемстваў падрыхтаваў і прадставіў у сакрэтным мемарандуме ад 11 лютага 1936 г. віленскі ваявода Л. Бацянскі. Выкладзеныя ў гэтым дакуменце меры адносна літоўскай меншасці патрэбна было практычна рэалізоўваць не толькі ў Віленскім, але і Беластоцкім, Навагрудскім ваяводствах. У дадатак да гэтага для ўмацавання «польскага пануючага стану» ваявода Л. Бацянскі ў лісце да дырэктара палітычнага дэпартамента МЗС Польшчы Т. Кабылянскага 30 красавіка 1937 г. прапанаваў разгарнуць сярод літоўцаў праз друк, лекцыйную і асветніцкую працу, фільмы, экскурсіі

ўзмоцненую прапагандысцкую кампанію [10, с. 289]. У памежнай зоне было забаронена слухаць літоўскае радыё, чытаць газеты, выдадзеныя ў Літве. У Вільні было заснавана інфармацыйнае бюро, якое займалася падрыхтоўкай рознатэматычных літоўскамоўных матэрыялаў, наладжаны выпуск радыёперадач «Літоўскія хвілінкі». Актыўна заняўся літоўскай праблематыкай існуючы там Навукова-даследчы інстытут Усходняй Еўропы [25, с. 82–83].

Карныя акцыі супраць літоўскіх арганізацый, разгорнутыя яшчэ напярэдадні прыняцця згаданых рашэнняў, набылі шырокамаштабны характар. Усяго на працягу 1936 – пачатку 1938 гг. было закрыта 28 гурткоў, 118 чытальняў, 61 пачатковая школа віленскага таварыства «Рытас», 217 бібліятэк таварыства Св. Казіміра [1, с. 219]. У Віленскім, Свянцянскім, Ашмянскім, Браслаўскім паветах арыштам і штрафам былі падвергнуты больш 270 актывістаў літоўскіх таварystваў. Многіх настаўнікаў, кіраўнікоў літоўскіх чытальняў, ксяндзоў падвяргалі высяленню. Толькі ў першай палове 1936 г. на тэрыторыі Лідскага павета было закрыта 35 гурткоў, чытальняў «Рытас» і таварыства Св. Казіміра. Пасля таго, як у лютым 1938 г. была закрыта апошняя прыватная літоўская пачатковая школа ў в. Дайнова, у Лідскім павеце не засталося ніводнай літоўскай пляцоўкі. Усяго за перыяд з 22 сакавіка 1936 г. да 21 сакавіка 1937 г. у Гродзенскім павеце было закрыта 18 чытальняў [3, с. 149]. Цэнтральная ўправа «Рытас» загадала кіраўнікам закрытых чытальняў заставацца на месцах і праводзіць нелегальную асветніцкую працу, займацца хатнім навучаннем дзяцей. Пасля вымушанай адсутнасці восенню 1936 г. кіраўнікі закрытых чытальняў Гродзенскага павета вярталіся назад і выказваліся за адкрыццё сельскагаспадарчых кааператываў. Польскія ўлады нярэдка разглядалі гэтых асобаў у якасці літоўскіх шпіёнаў [26]. 21 лістапада 1936 г. беластоцкі ваявода не дазволіў дзейнічаць структурным адзінкам таварыства Св. Казіміра на тэрыторыі Сувалкаўскага і Гродзенскага паветаў, потым – у памежнай зоне. Канчаткова гарадскія ўлады Вільні забаранілі дзейнасць таварыства Св. Казіміра 31 снежня 1937 г. Такі ж лёс напаткаў 28 лютага 1938 г. і таварыства «Рытас» [27].

Некаторыя спадзяванні адносна адраджэння літоўскага культурна-асветніцкага жыцця з'явіліся пасля ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Польшчай і Літвой у сакавіку 1938 г. Былыя кіраўнікі чытальняў, настаўнікі пачалі збор подпісаў пад хадайніцтвамі да польскіх уладаў аб атрыманні дазволаў на адкрыццё літоўскіх устаноў [28]. Летам 1938 г. у Гродзенскім павеце дамагаліся аднаўлення гурткоў таварыства Св. Казіміра [29]. Хоць гэтыя захады засталіся безвыніковымі, у пачатку 1939 г. праца па стварэнню такіх гурткоў у Гродзенскім павеце актывізавалася. Адначасова там складваліся дэкларацыі аб адкрыцці літоўскіх школ [30].

Аднак асцярожная спроба нармалізацыі польска-літоўскіх міждзяржаўных адносін напярэдадні Другой сусветнай вайны не палепшыла карэнным чынам адносіны паміж польскай і літоўскай супольнасцямі. Так і не адбыліся пазітыўныя змены ў становішчы літоўскай меншасці ў Польшчы, што не аслабіла яе антыпольскіх настрояў, не адмяніла негатыўнае стаўленне Літвы адносна тэрытарыяльнай прыналежнасці Віленшчыны. Уступкі на карысць адкрыцця забароненых літоўскіх арганізацый зноў былі пастаўлены ў залежнасць ад адпаведных захадаў адносна палякаў у Літве. У распрацаванай МУС Польшчы вясной 1939 г. «Дырэктыве па літоўскай палітыцы» прадугледжваліся не толькі ўзаемныя ўступкі, але і меры па лакалізацыі літоўскага руху, узмацненню яго лаяльнасці да дзяржавы. У такіх умовах было вельмі складана аднавіць ранейшую сетку літоўскіх арганізацый.

Некаторае ажыўленне літоўскага культурна-асветніцкага жыцця назіралася летам 1939 г., што было выклікана ад'ездам напярэдадні з Вільні Л. Бацянскага. Стараста Свянцянскага павета паведамляў у сваёй справаздачы за ліпень 1939 г. у Вілейскую павятовую камендатуру дзяржпаліцыі, што «літоўскае насельніцтва, а найперш літоўскія дзеячы, праявілі значную палітычную актыўнасць у справе арганізацыі гурткоў літоўскага асветніцкага таварыства «Рытас» [31]. Аднак пачатак Другой сусветнай вайны не дазволіў прадоўжыць аднаўленне арганізацыйнай сеткі таварыства.

У цэлым, нешматлікая літоўская інтэлігенцыя, каталіцкае духавенства прыклалі максімальныя намаганні ў ажыўленні асветніцтва ў міжваенны час. Знешні фактар (матэрыяльная і маральная падтрымка з боку Літвы) сыграў істотную ролю ў станаўленні і развіцці літоўскіх культурна-асветніцкіх арганізацый у міжваеннай Польшчы. Нягледзячы на адміністрацыйна-паліцэйскія перашкоды і абмежаванні, менавіта гэтыя арганізацыі (найперш таварыствы «Рытас» і Св. Казіміра) змаглі рэалізаваць на практыцы свае статутныя задачы, спрыялі адраджэнню нацыянальнай самасвядомасці літоўцаў на памежжы, хоць яна там заставалася слабай. У адрозненне ад Свянцянскага, Віленска-Трокскага, Сувалкаўскага паветаў, дзе літоўскі культурна-асветніцкі рух набыў масавы характар, у памежных мясцовасцях таварыствы не атрымалі такой шырокай падтрымкі з боку мясцовай літоўскай грамадскасці на працягу ўсяго разглядаемага перыяду, аднак з'яўляліся вядучымі арганізаванымі структурамі, якія найбольш паслядоўна і эфектыўна адстойвалі яе нацыянальна-культурныя і рэлігійныя інтарэсы.

*Літаратура*

1. Makowski, B. Litwini w Polsce. 1920–1939 / B. Makowski. – Warszawa: PWN, 1986. – 351 s.

2. Martinkėnas, V. Vilniaus krašto lietuviškos mokyklos ir skaityklos 1919–1939 metais / V. Martinkėnas. – Vilnius:

Mokslas. 1990. – 157 p.

3. Lidos krašto lietuviai: monografija: 2 tomai / Red. komis.: N. Vėlius (pirm.) ir kt. – Kaunas: Poligrafija ir informatika. 2002. – 392 đ.

4. Wilno i Ziemia Wileńska: Zarys monograficzny. – Wilno: Wydawnictwo Wojewódzkiego komitetu regjonalnego. 1930. – Ń. 1. – 334 s.

5. Wasilewski. L. Litwa i Białoruś: Zarys historyczno-polityczny stosunków narodowościowych / L. Wasilewski. – Warszawa-Kraków: Wydawnictwo J. Mortkowicza. 1925. – 251 s.

6. Tomaszewski J. Ojczyzna nie tylko Polaków: Mniejszości narodowe w Polsce w latach 1918–1939 / J.Tomaszewski. – Warszawa: Młodieżowa Agencja Wydawnicza. 1985. – 224 s.

7. Eberhadt. P. Przemiany narodowościowe na Litwie / P. Eberhadt. – Warszawa: Przegląd wschodni. 1997. – 307 s.

8. Зинкявичюс. З. Восточная Литва в прошлом и настоящем / З. Зинкявичюс. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijш leidykla. 1996. – 388 с.

9. Żołędowski. C. Białorusini i Litwini w Polsce. Polacy na Białorusi i Litwie: Uwarunkowania współczesnych stosunków między większością i mniejszościami narodowymi / C. Żołędowski. – Warszawa: ASPRA-JR. 2003. – 360 s.

10. Łossowski. P. Stosunki polsko-litewskie. 1921–1939 / P. Łossowski. – Warszawa-Łowicz: Instytut historii PAN. Mazowiecka wyższa szkoła humanistyczno-pedagogiczna. 1997. – 391 s.

11. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). – Фонд 200. – Воп. 2. – Спр. 7. – Арк. 79.

12. ДАГВ. Фонд 38. – Воп. 1. – Спр. 19. – Арк. 201.

13. Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна. – Фонд 4. – Воп. 1. – Спр. 403. – Арк. 17.

14. ДАГВ. Фонд 551. – Воп. 1. – Спр. 208. – Арк. 7–8

15. Polskie szkolnictwo i oświata na Litwie / Pod red. A. Szerlag. – Wrocław: Wydawnictwo Uniwersytetu Wrocławskiego. 1998. – 129 s.

16. ДАГВ. Фонд 88. – Воп. 1. – Спр. 22. – Арк. 135.

17. Цэнтральны дзяржаўны архіў Літвы (ЦДАЛ). – Фонд 172. – Воп. 1. – Спр. 3818. – Арк. 22; Спр. 3668.

18. ДАГВ. Фонд 662. – Воп. 3. – Спр. 38. – Арк. 97.

19. Urbański. Z. Mniejszości narodowe w Polsce / Z. Urbański. – Warszawa: Wydawnictwo «Mniejszości narodowe». 1932. – 380 s.

20. ДАГВ. Фонд 200. – Воп. 2. – Спр. 9. – Арк. 17.

21. Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна. – Фонд 4. – Воп. 1. – Спр. 534. – Арк. 114.

22. ДАГВ. Фонд 38. – Воп. 1. – Спр. 52. – Арк. 349.

23. Archiwum Państwowe w Białymstoku. – Zespół 47. – Sygnatura 91. – S. 33. 45.

24. ДАГВ. Фонд 200. – Воп. 2. – Спр. 13. – Арк. 258.

25. Pšibilskis. V.B. Iš lietuvos XX a. kultūros istorijos / V.B. Pšibilskis. – Vilnius: Vilniaus universitetas. 1997. – 224 p.

26. Archiwum Państwowe w Białymstoku. – Zespół 47. – Sygnatura 91. – S. 93 адв., 101 адв.. 113. 127 – 127 адв.

27. Бібліятэка АН Літвы. – Аддзел рукапісаў. – Фонд 254. – Спр. 153. – Арк. 1–4.

28. Archiwum Państwowe w Białymstoku. – Zespół 47. – Sygnatura 100. – S. 74. 76.

29. ДАГВ. Фонд 17. – Воп. 1. – Спр. 352. – Арк. 7.

30. Archiwum Państwowe w Białymstoku. – Zespół 47. – Sygnatura 107. – S. 14 адв.

31. Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна. – Фонд 10. – Воп. 1. – Спр. 214. – Арк. 6. 28.

Паступіў у рэдакцыю 07.06.2006.

***Вабішчэвіч Аляксандр Мікалаевіч,*** кандыдат гістарычных навук, загадчык кафедры гісторыі культуры і рэлігіі Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта.

The article deals with the evolutionary development of the Lithuanian cultural and educational associations *Ritas* and the one named after St.Kasimir on the territory of Byelorussian-Lithuanian-Polish border in 1920–1939. The author shows the activities of the Lithuanian schools, libraries and societies: their role in resistance to assimilation of the Lithuanian population. Lithuanian cultural and educational movement is reflected in the context of complicated interstate relations between Poland and Lithuania and social-political situation in the region. The author uses the resources from the archives of different countries which have never been used before.

УДК 2-84

**Э.С. ЯРМУСИК**

# ГОСУДАРСТВЕННО-КОНФЕССИОНАЛЬНЫЕ ОТНОШЕНИЯ В БЕЛАРУСИ: ИСТОРИЧЕСКИЙ ОПЫТ

В статье прослеживается эволюция конфессиональной политики и взаимоотношений политики, и взаимоотношений государства с ведущими религиозными конфессиями – православной и католической. Автор отмечает, что в основе этой политики лежала марксистско-ленинская идеология. В конечном итоге она была направлена на окончательное уничтожение любой религии. Вплоть до распада СССР на государственно-конфессиональные отношения сильное влияние оказывала коммунистическая партия. Анализируется законодательство о культах, причины и факторы, оказывавшие влияние на его корректировку. Декларируя равенство всех вероисповеданий перед законом, государство, тем не менее, отдавало преимущество православной церкви, используя при этом её возможности в борьбе с католицизмом, прежде всего с его центром – ватиканом. Поворот во взаимоотношениях государства и религиозных конфессий наступил лишь в конце 1980-х годов. В начале 1990-х годов, в связи с обретением независимости, в Республике Беларусь коренным образом стало изменяться положение религиозных конфессий. Учитывая горький опыт прошлого, суверенное белорусское государство стремится строить отношения с религиозными конфессиями на принципиально новых основаниях.

Процессы коренного обновления белорусской государственности в последние десятилетия существенным образом затронули область государственно-конфессиональных отношений, жизнедеятельность религиозных организаций и верующих. Подверглись переоценке, казавшиеся ещё недавно решенными, принципиальные вопросы взаимоотношений государства и религиозных институтов, законодательства о культах, роли и места религиозных конфессий в обществе, свободы совести и другие.